


# ЛЮСТЭРКА ЛЁСУ

***Ад рэдакцыі.** У выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла кніга доктара педагагічных навук, прафесара матэматыкі, заслужанага дзеяча навукі Рэспублікі Беларусь Аляксандра РАДЗЬКОВА «Мой фізмат». Вучоны доўгі час працаваў у Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова. Прайшоў усе ступені — ад студэнта да рэктара гэтай навучальнай установы. Асноўны перыяд «магілёўскага жыцця» Аляксандра Міхайлавіча — вучоба і праца на фізіка-матэматычным факультэце. Пра сваіх калег — настаўнікаў, старэйшых таварышаў, паплечнікаў — і расказвае А. Радзькоў у кнізе «Мой фізмат». Часам расказвае з гумарам, часам — з разлікам на павучальнасць. Некаторыя старонкі кнігі вучонага і педагога мы прапануем чытачам «Звязды».*

*Нагадаем, што з 2003 па 2010 год Аляксандр Радзькоў — міністр адукацыі Беларусі. У 2010—2014-м — першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. У 2014—2015-м — памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. З 2007 па 2018 год — старшыня Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь».*

**Аляксандр РАДЗЬКОЎ**

# З кнігі «МОЙ ФІЗМАТ»

## Пётр Пятровіч МАШКОЎСКІ

У 1968 годзе, калі я паступіў у Магілёўскі педінстытут, дэканам фізіка-матэматычнага факультэта быў Пётр Пятровіч Машкоўскі. Невялікага росту, шчупленькі, сівы, хадзіў, цягаючы ногі па зямлі, гаварыў ціха, але мы ўсе інтуітыўна адчувалі ў ім добрага чалавека. З першых дзён вучобы ў інстытуце ён стаў чытаць нам курс элементарнай матэматыкі. І практычныя заняткі вёў сам.

Пётр Пятровіч быў з пакалення франтавікоў. Ім, на вялікі жаль, было не да навуковых даследаванняў, шчасцем для іх было выжыць. Таму Машкоўскі не меў ні вучонай ступені, ні вучонага звання. Аднак яго матэматычныя здольнасці, матэматычная культура былі відавочныя. Курс элементарнай матэматыкі заўсёды разлічаны на пашырэнне і паглыбленне школьнай праграмы. Ён быў карысны не толькі зместам, напоўнены мноствам задач на практычных занятках, але і даваў магчымасць навярстаць упушчанае ў школе, падрыхтавацца, пры гэтым усім студэнтам адначасова, да вывучэння фундаментальных раздзелаў вышэйшай матэматыкі. Слухалі мы лекцыі Пятра Пятровіча зачараванa. Ён чытаў без канспекта, роўна, можна сказаць, без знешніх эмоцый. Але адчувалася, што ён любаваўся харастворм матэматычных канструкцый, вытанчанасцю формул, арыгінальнасцю задач. У аўдыторыю ўваходзіў дакладна па званку, а на перапынак паміж гадзінамі лекцыі ці напрыканцы яе, пачуўшы трэль званка, ішоў адразу ж, мог нават не дагаварыць сказ.

На фізмат у той год паступіла 110 першакурснікаў. Але планавых месцаў было толькі сто. Жыццё паказала, што напружанасць вучобы на гэтым факультэце вытрымлівалі не ўсе, таму набіралі яшчэ дзесяць так званых кандыдатаў. І вось мы падышлі да першай сесіі. Перад пачаткам залікаў і экзаменаў для першакурснікаў мы павінны былі прайсці адпаведны інструктаж: правілы арганізацыі і правядзення залікаў і экзаменаў, нашы правы і абавязкі, магчымасці перездачы, крытэрыі паспяховасці для атрымання стыпендыі і колькасць «правалаў», пасля якіх ідзе адлічэнне. Тут мы ўпершыню пабачылі Пятра Пятровіча ў ролі дэкана. Ён прыйшоў да нас, маўкліва, уважліва ўсіх агледзеў і ціхім голасам сказаў:

— Вас тут 110, а пасля сесіі павінна застаца не болей ста. Старайцеся. Жадаю поспехаў.

І пайшоў.

Сам Машкоўскі прымаў у нас экзамен таксама досыць арыгінальна. Запрасіў у аўдыторыю першую пяцёрку студэнтаў. Паглядзеў на нас, паклаў на стол стос білетаў, адвярнуўся і пайшоў да акна. Гледзячы на вуліцу, сказаў:

— Выбірайце!

Білеты з роўнага стоса ўзляцелі ў паветра: іх перабіралі, мянялі, абмяркоўвалі паміж сабой выбар. Пётр Пятровіч нават не паварочваўся да нас. Пасля спытаўся:

— Выбралі?

Запісаў нашы прозвішчы, нумары білетаў і стаў чакаць адказаў. Зразумела, за семестр на лекцыях і практычных занятках ён усіх нас добра вывучыў і ацаніў. Таму адыходзіў ад лішніх, з яго пункту гледжання, фармальнасцяў. Але адказы слухаў уважліва і ацэнкі былі аб'ектыўныя.

Інтэрнат, у якім мы жылі, быў побач з вучэбным корпусам. Заняткі пачыналіся а восьмай гадзіне раніцы, але студэнцкае жыццё насычанае, разнабаковае, вясёлае, таму не ўсе студэнты, асабліва пасля шумных вячэрніх мерапрыемстваў, своечасова прыходзілі на першую пару лекцый. І гэта пры тым, што наведванне заняткаў было абавязковым і даволі строга кантралявалася. Пётр Пятровіч практыкаваў ранішнія паходы ў інтэрнат. Гаварыў сваёй сакратарцы ў дэканаце:

— Валя! Я пайду ў інтэрнат будзіць сваіх дзетак.

У пакоях жыло па 5-6 студэнтаў, дзверы ніколі на ключ не зачыняліся, дэкан, ціхенька пагрукаўшы, уваходзіў, знаходзіў пад коўдрай спячага студэнта і шаптаў:

— Вова! Прачынайся! Заняткі ўжо пачаліся, там цябе ўсе чакаюць!

Эфект атрымліваўся неверагодны. Такіх паходаў дэкана на нашых пакоях мы чамусьці баяліся. Пропуск заняткаў заўважна скараціўся.

Здараліся ў час такіх хаджэнняў Пятра Пятровіча на пабудкі студэнтаў і анекдатычныя гісторыі. Студэнты геафака вучыліся ў другую змену, таму і спалі даўжэй. Іх пакоі былі на другім паверсе, прычым упераметку з нашымі, фізматаўскімі. Пётр Пятровіч, перад тым як увайсці, глядзеў вывешаны на дзвярах спіс жыльцоў. Прозвішчы ўсіх сваіх студэнтаў ён ведаў напамяць. І гэтым разам у канцы спіса ўбачыў прозвішча «Хлабыстаў». Ён ведаў, што Саша дысцыплінай не вызначаўся, і вырашыў зайсці праверыць, ці пайшоў ён на восьмую гадзіну на заняткі. Увайшоў і, да свайго здзіўлення, заўважыў, што патрапіў да дзяўчат, якія спалі. Адразу развярнуўся, але на ўнутраным баку дзвярэй сутыкнуўся вачыма ўжо з іншым спісам — графікам прыборкі пакоя, і там таксама, сярод дзявочых прозвішчаў, апошнім стаяла прозвішча Хлабыстава. Пётр Пятровіч канчаткова разгубіўся, але будзіць нікога не адважыўся. Гэта гісторыя ўсіх нас развесяліла. Мы ж ведалі, што Саша сябруе з дзяўчынай, якая вучыцца на геафаку, і так часта бывае ў іх пакоі, што яны ўключылі яго ў спісы жыльцоў.

У Машкоўскага былі вельмі арыгінальныя, але на дзіва дзейсныя метады выхавання. Аднойчы мой старэйшы брат, таксама студэнт фізмата, трапіўся з кампаніяй на выпіўцы ў пакоі інтэрната. І менавіта ён быў арганізатарам гэтага мерапрыемства. За такі ўчынак пагражала адлічэнне з інстытута, а для яго гэта быў поўны крах. Вова ўжо быў жанаты, у яго нарадзіўся сын і, разумеючы непазбежнасць пакарання, знаходзіўся ў маркотным стане. Брату перадалі, што яго выклікае дэкан. Ён прыйшоў у прызначаны час, пагрукаў, пачуў запрашэнне ўвайсці і ўбачыў Пятра Пятровіча за рабочым сталом. Дэкан займаўся падрыхтоўкай раскладу. Убачыўшы брата, падняў галаву і сказаў:

— А, Радзькоў! Заходзь!

І зноў схіліўся над раскладам. Так праходзіла дзесяць хвілін, дваццаць, паўгадзіны, сорак хвілін. Дэкан працуе, брат, перамінаючыся з нагі на нагу, стаіць. І вось Пётр Пятровіч падымае галаву і гаворыць:

— Ну, ты ўсё зразумеў?

— Так, Пётр Пятровіч, такога болей не паўторыцца!

— Тады ідзі!

Гэты ўрок брат, будучы дырэктар школы, запомніў на ўсё жыццё.

На ўсіх нашых сходах, камсамольскіх, прафсаюзных, Машкоўскі заўсёды прысутнічаў і выступаў. Гаварыў, як звычайна, спакойна, ціха, але патрабавальна. Аднойчы на нейкім сходзе Пётр Пятровіч не пагадзіўся з прапановай прафсаюзных актывістаў і з трыбуны стаў тлумачыць чаму. У гэты час старшыня прафкама Таццяна Хаўбок, знаходзячыся побач з трыбунай, спачатку жэстамі, грымасамі пачала заводзіць нас, каб мы шумам, крыкамі сталі пярэчыць дэкану. Ён бачыў яе спробы, але не звяртаў на гэта ніякай увагі. Гаварыў, як і раней, спакойна, ціхім голасам. І быў пераканаўчы. На захады Таццяны мы не паддаліся.

Неяк аднойчы на факультэцкім партыйным сходзе прафесар Столяр заявіў, што у нас няма заўважных зрухаў у навуковай працы, у вучэбна-выхаваўчым працэсе. Яго ў гэтым эмацыянальна падтрымаў дацэнт Жылік. Тады Пётр Пятровіч падняўся і зноў жа спакойна сказаў:

— Паважаныя Аляксандр Аронавіч і Канстанцін Канстанцінавіч! Не губляйце час на выкладанне сваіх ідэй і іх абмеркаванне. Адразу пачынайце думаць, як іх рэалізаваць. Не адкладваючы, займіцеся справай!

На пачатку сямідзясятых у інстытуце змяніўся рэктар, ён пачаў да кіраўніцтва факультэтаў, кафедр прыцягваць кандыдатаў навук, дацэнтаў. Пятру Пятровічу давялося сысці на пасаду намесніка дэкана. Ён перажываў, хоць знешне гэта было непрыкметна. Працягваў усюды выказваць сваю пазіцыю і стрымана, але настойліва, яе адстойваць. Адчуў, што далёка не ўсім і не заўсёды гэта падабаецца, дапрацаваў да шасцідзесяці гадоў і сышоў на пенсію. Купіў дом у вёсцы і зусім перабраўся туды жыць. На факультэце з'яўляўся адзін раз у год, каб заплаціць партыйныя ўзносы, хоць нават не прыязджаў на сходы. Знаходзіў мяне, тады ўжо намесніка дэкана, адводзіў куды-небудзь у куток і прасіў:

— Саша! Раскажы мне, што тут у нас за год адбылося?

Я і цяпер памятаю гэтыя нашы размовы. Пётр Пятровіч прыязджаў у зімовым паліто, яно было крышачку прысыпана сенам (падобна на тое, што ён актыўна займаўся сельскай гаспадаркай), вочы яго былі жывыя, вясёлыя, смех шчыры. Яго цікавілі гісторыі самыя розныя, літаральна пра ўсіх выкладчыкаў, лабарантаў, студэнтаў. Мы звычайна гаварылі па дзве-тры гадзіны запар і гэта, пэўна, адны з самых лепшых момантаў майго жыцця...

## Аляксандр Яўстафавіч НЕСЦЕРАЎ

Электратэхніку Несцераў ведаў. Ён не меў ні вучонай ступені, ні вучонага звання, але ўспрымаўся намі як самы высокі прафесіянал. Строгі і на лекцыях, і на практычных занятках, і на лабараторных працах, ён ніколі не жартаваў, са студэнтамі трымаў дыстанцыю, і мы ўсе ведалі, што ён на экзамене надзвычай патрабавальны. Але слухаць яго лекцыі было адно задавальненне. Я па сваёй прыродзе не «тэхнар», але электратэхнікай, дзякуючы Аляксандру Яўстафавічу, пранікся. Мне з ім было цікава.

Несцераў да студэнтаў быў уважлівы — убачыў, у прыватнасці, што мы з Валерыем Івановым захопленыя матэматыкай (на чацвёртым курсе, калі ён да нас прыйшоў чытаць лекцыі, мы ўжо займаліся ў гуртку дацэнта Браніслава Міхайлавіча Архіпава). Таму асабліва нас не трывожыў і не напружваў, хоць аднойчы выгнаў нас з лекцыі. Мы з Валерам ад нечага рассмяяліся і ніяк не маглі спыніцца. Аляксандр Яўстафавіч не стаў разбірацца, хто з нас вінаваты ў такіх паводзінах, выдаліў з аўдыторыі абодвух. Але гэта ніяк не сказалася на яго адносінах да нас. І ўжо зусім легенда, звязаная з Аляксандрам Яўстафавічам. На фізмаце ў той час быў Васіль Кавалёў. Ён таленавіта чытаў на сцэне ўрыўкі з раманаў Міхаіла Шолахава. Калі ён расказваў пра прыгоды дзеда Шчукара, зала не проста смяялася, усе літаральна плакалі ад смеху. Але вучоба, асабліва прадметы фізіка-матэматычнага цыкла, Васю даваліся з цяжкасцю. Без нездавальняючых адзнак у яго не абыходзілася ні адна сесія. Адлічэння з фізмата яму ўдавалася пазбегнуць таму, што ўсе выкладчыкі чулі яго выступленні на сцэне. І раптам мы даведваемся, што на экзамене па элетратэхніцы Вася атрымаў «выдатна». І гэта ў самога Несцерава?! Гэта было настолькі нечакана, што мы адважыліся спытаць у Аляксандра Яўстафавіча, за што ён Васю ўсё ж такі паставіў найвышэйшы бал. Несцераў адказаў, не хаваючыся:

— Я дваццаць гадоў выкладаю электратэхніку, але першы раз у жыцці ўбачыў, як з дапамогай рук і ног можна паказаць працу трохфазнага элетрарухавіка!

Несцераў быў сапраўдным фізматаўцам, таму пасля яго і засталіся жывыя легенды.

**Пераклаў з рускай мовы Максім ВЕЯНІС.**

*(Працяг будзе).*